Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№20(411) | Пятніца, 10 чэрвеня 1960 года | ЦАНА 10 КАП

Да 40-годдзя ЛКСМБ

Памножым працоўную славу

Слаўныя працоўныя традыцыі ў камсамольскай арганізацыі нашага універсітэта. У летапісу гераічнай барацьбы савецкага народа за асваенне цалінных зямель ёсць радкі, якія ўпісаны нашымі пасланцамі. Студэнты універсітэта кожны год актыўна ўдзельнічалі ў сезонных сельскагаспадарчых работах, на будаўніцтве інтэрнатаў.

Сёлета камсамол Беларусі будзе адзначаць саракавую гадавіну свайго існавання. Слаўны юбілей камсамольская арганізацыя універсітэта збіраецца сустрэць новымі працоўнымі падарункамі нашай Радзіме, свайму народу.

200 пасланцоў універсітэта будуць працаваць летам на асушцы балот у Любанскім раёне. Меліяратары гасцінна сустрэнуць студэнтаў — іх забяспечаць жыллём, яны будуць атрымліваць заработную плату.

З нецярпеннем будуць чакаць нашых студэнтаў і будаўнікі Старобінскага калійнага камбіната. Туды ў дзве змены выедзе 100 чалавек: 50 у ліпені, 50—у жніўні. Студэнты не толькі ўзнімуцца на рыштаванні, каб поплеч, рука аб руку са сваімі сябрамі будаваць Салігорск. Яны таксама будуць дапамагаць камсамольцам камбіната рыхтавацца да паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Адной з істотнейшых новабудоўляў сямігодкі з'яўляецца газаправод Дашава-Мінск, увядзенне якога ў строй значна ўмацуе энергетычную базу рэспублікі. На будаўніцтве газаправода студэнты універсітэта будуць працаваць у чатыры змены па 200 чалавек, з 1 па 15 ліпеня і з 16 па 31 жніўня. Кожная змена адпрацуе адзін рабочы тыдзень.

Акрамя гэтага кожны дзень па 50 камсамольцаў будуць працаваць на будаўніцтве галоўнага корпуса універсітэта. Сваёй працай яны дапамогуць будаўнікам значна раней вызначанага тэрміну здаць галоўны корпус у эксплуатацыю.

У цэлым, згодна з рашэннем камітэта камсамола, кожны студэнт універсітэта ў час летніх канікул адпрацуе 46 рабочых гадзін, або цэлы працоўны тыдзень. Несумненна наша моладзь значна перавысіць гэты паказчык і яшчэ больш памножыць працоўную славу камсамольскай арганізацыі універсітэта.

Р. МАЛЮКОВІЧ,
сакратар камітэта камсамола

Адказы лепшых ацэнены вышэйшым балам

*
(РЭПАРТАЖ)
*

Людміла Ціхамірава, адказваючы на дадатковае пытанне, паказвае эканамічныя раёны Албаніі.

Такім выпрабавальным каменем для студэнтаў IV курса геафака з'явіўся экзамен па эканамічнай геаграфіі краін народнай дэмакратыі. Так, выдатных адзнак у групе эканом-географаў было нямнога. Але гэта не значыць, што студэнты адказвалі слаба. Не, нават такі патрабавальны экзаменатар, як Сцяпан Максімавіч Мельнічук, вельмі высока ацаніў многія адказы. Трэба ўлічыць і новаўвядзенне—эканамічныя карты на экзамене адсутнічалі.

Добра адказвала Жугіна аб развіцці машынабудавання ў краінах народнай дэмакратыі. Падрабязна асвятліла яна пытанне аб развіцці сацыялістычнай

Адказвае Анатоль Жадан.

сусветнай гаспадаркі і аб сацыялістычнай сістэме раздзялення працы. Але... некалькі недакладнасцей—і ацэнка зніжана на бал. Што ж, «добра» гэта таксама добра.

Але вось да дошкі падыходзіць Ніна Макарэвіч. Некалькі хвалюючыся, яна пачынае адказваць, Але адчуваецца, што дзяўчына добра ведае пытанні білета. Паступова яна спраўляецца з хваляваннем. Ніна грунтоўна расказала аб развіцці металургіі ў краінах народнай дэмакратыі Еўропы, дала эканамічна-геаграфічную характарыстыку Паўночнага Усходу Румыніі, расказала пра гарады гэтага раёна.

Ніна першай атрымлівае выдатную адзнаку, і, трэба сказаць, рука ў яе аказалася лёгкай.

Вось да геаграфічнай карты падыходзіць Анатоль Жадан. У яго даволі складаныя пытанні — «Энергетыка краін народнай дэмакратыі» і «Развіццё машынабудавання ў краінах народнай дэмакратыі Азіі». Анатоль адказвае ўпэўнена, як гавораць, без запіначкі. Ён называе дакладныя лічбы запасаў вугалю, нафты, гаручых сланцаў у краінах народнай дэмакратыі, паказвае на карце раёны іх размяшчэння, характарызуе эканамічныя выгоды эксплуатацыі. Некалькі дадатковых пытанняў,—і экзаменатар выводзіць у заліковай кніжцы Жадана «выдатна».

Калі адчуваеш, што ведаеш пытанні білета, можна і паслухаць, як адказвае таварыш...

Вельмі добра адказвала Людміла Ціхамірава. Яна падрабязна расказала пра фармаванне тэрыторыі Румыніі, геаграфічнае становішча, насельніцтва і пра дзяржаўны лад. Гэтак жа добра ведала Людміла і сельскую гаспадарку, транспарт і знешнія сувязі Германскай дэмакратычнай рэспублікі.

—Малайчына, —не ўтрымаўся ад пахвалы Сцяпан Максімавіч, калі ўжо аддаваў Людміле заліковую кніжку.

І толькі Л. Дробыш будзе вымушана яшчэ адзін раз сустрэцца з экзаменатарам. З яе адказу адчувалася, што матэрыял курса дзяўчына ведае вельмі павярхоўна. На многія пытанні Дробыш адказвала наўгад. Так на пытанне экзаменатара, колькі металургічных заводаў ёсць ва Ухаші,—яна адказала, што больш дзесяці.

Яновіч задаволены—білет трапіў яму няцяжкі.

У цэлым жа геграфы паказалі трывалыя веды. 75 працэнтаў адказаў былі ацэнены вышэй «здавальняюча», а лепшыя з лепшых—выдатнымі адзнакамі.

А. ГАРЭЗНЫ

Ля карты—Ніна Макарэвіч. Гэта з яе лёгкай рукі ў экзаменацыйнай ведамасці пачалі паяўляцца «выдатна».

З вопыту работы кафедраў

Абарона прайшла арганізавана

У мінулыя гады абарона дыпломных работ звычайна зацягвалася да чэрвеня. Улічыўшы гэта, кафедра тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку сёлета ў пачатку другога семестра склала графік, згодна з якім абарона дыпломных работ павінна была пачацца і завяршыцца ў красавіку. У графіку дакладна ўказваўся дзень абароны дыпломнай работы кожнага студэнта. Гэта спрыяльна сказалася на выніках. Студэнты стацыянара завяршылі абарону дыпломных да 20 красавіка, а завочнікі—да 1 мая.

Палепшылася якасць кіраўніцтва і рэцэнзавання дыпломных работ. Разам з членамі кафедры да кіравання дыпломнікамі былі прыцягнуты некаторыя вопытныя журналісты-практыкі: В. А. Пыжкоў, І. М. Агееў, Б. В. Паўлёнак, Г. В. Будай, Н. А. Конанава, А. С. Жыхар.

Новым было і тое, што дзве дыпломныя работы ўяўлялі сабой самастойныя выступленні студэнтаў у друку. Размова ідзе аб дыпломнай рабоце І. Сіпакова «Партрэт сучасніка» (нарысы і замалёўкі аб людзях сямігодкі) і рабоце выпускніка завочнага аддзялення супрацоўніка газеты «Літаратура і мастацтва» Г. Загароднага «Да новага ўздыму музыкальнай культуры» (карэспандэнцыі, артыкулы, рэцэнзіі і нарысы, надрукаваныя ў рэспубліканскай прэсе). Гэтыя работы паказалі журналісцкую сталасць дыпламантаў.

Цікавыя па актуальнасці тэматыкі і грунтоўнаму асвятленню пытанняў дыпломныя работы студэнтаў А. Акуліка «Людзі будучага» (брыгады камуністычнай працы ў асвятленні газеты «Комсомольская правда»), Н. Храмцэвіча «Пытанні тэхнічнага прагрэсу на старонках шматтыражных газет «Трактор» і «Автозаводец», І. Рудамётава «Аб беларускім дакументальным кіно».

Сур'ёзныя даследаванні па гісторыі партыйна-савецкага друку і гісторыі беларускага друку напісалі студэнты А. Роніс, А. Чарненкава, П. Казачонак, П. Барташэвіч. Студэнт В. Машкоў прысвяціў сваю работу публіцыстыцы Раісы Рэйснер, завочнік В. Макарэвіч напісаў дыпломную работу на тэму: «В. Харужая—палымяны публіцыст і журналіст».

Звярнула на сябе ўвагу дыпломная работа завочніка Раманчука «Назіранні над мовай і стылем артыкулаў і публіцыстычных выступленняў У. І. Леніна паслякастрычніцкага перыяду». Гэта першая творчая спроба даследаваць малавывучаную, але вельмі важную для журналістыкі тэму. Кафедра прызнала мэтазгодным рэкамендаваць да друку работу В. Раманчука. Такія ж рэкамендацыі заслужыла работа А. Роніс, якая прысвяціла сваё даследаванне латышскай газеце «Ежедневный листок» (1886—1895 гг.), рэдактарам якой з'яўляўся А. Райніс, а таксама дыпломная Ю. Чурко—«Стварэнне першага беларускага нацыянальнага балету «Салавей».

У ходзе абароны дыпломных работ высветлілася, што некаторыя студэнты не валодаюць у дастатковай ступені метадам аналізу жанраў, мовы і стыля газеты. Павярхоўныя ўяўленні маюць студэнты аб творчасці выдатных бальшэвікоў-публіцыстаў В. В. Варонскага, М. С. Альмінскага, Ем. Яраслаўскага. Тое ж можна сказаць аб творчасці сучасных публіцыстаў і фельетаністаў.

У дыпломных работах, якія прысвечаны, практычнай дзейнасці ў нашы дні студэнты нярэдка не крытычна падыходзяць да ацэнкі газетных матэрыялаў. Другія ж наадварот, пачынаюць гаварыць мовай дырэктыў, загадным тонам, што не вельмі да месца ў дыпломных работах.

Каб ліквідаваць адзначаныя вышэй недахопы, кафедра ў будучым годзе ўводзіць у адпаведныя курсы практычныя заняткі, якія павінны дапамагчы студэнтам авалодаць метадам аналіза газетных жанраў, мовы і стыля газеты. Маецца на ўвазе таксама ўвесці з будучага года спецкурсы па вывучэнню творчасці выдатных публіцыстаў дакастрычніцкага і савецкага перыяду.

М. С. ЗЯРНІЦКІ,
дацэнт, загадчык кафедры тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку.

Нялёгкае выпрабаванне

Гэта сесія для студэнтаў IV курса хімічнага факультэта была бадай што цяжэйшай, чым усе папярэднія. І на самай справе. Ім патрэбна было здаць на працягу месяца шэсць экзаменаў: калоідную хімію, хімічную тэхналогію, дыялектычны матэрыялізм, палітэканомію, замежную мову і, у залежнасці ад спецыялізацыі, арганічны аналіз ці метады даследавання неарганічных рэчываў.

Трэба адразу сказаць, што курс з гонарам выйшаў з нялёгкага выпрабавання. Ні адзін са здаваўшых студэнтаў не атрымаў нездавальняючай адзнакі. Больш таго, нават «тройкі» былі рэдкай з'явай на гэтым курсе. Асабліва добра здавалі хімікі спецыяльныя прадметы. Так па калоіднай хіміі 50 чалавек атрымалі добрыя і выдатныя адзнакі, і толькі адзін—здавальняюча.

Поўнасцю на выдатна ўсе экзамены здалі В. Астапенка, М. Баркоўская, Н. Жучкова, Л. Патаніна, А. Цыбулька, А. Шэўчук, Г. Шыбаева, Н. Сокалаў. Большасць выдатных адзнак стаяць у заліковых кніжках В. Глазкова, Л. Граковіч, Г. Дудзіна, В. Лапцёва, Л. Лазарчык, В. Трацэўскай.

Цяпер студэнты-хімікі праходзяць вытворчую практыку.

В. ШЭІН.

Час рыхтавацца да нарады

У лістападзе 1960 года пры нашым універсітэце будзе праходзіць Усесаюзная навуковая нарада на тэму: «Роля брыгад камуністычнай працы ў развіцці камуністычных адносін да працы». Рух брыгад і ўдарнікаў камуністычнай працы, быццам вясновая, ўсёперамагаючая плынь, ахапіла ў сябе ўсё больш і больш рабочых прамысловасці, працаўнікоў савецкай вёскі. Брыгады камуністычнай працы ўзялі сабе на ўзбраенне дэвіз: «Жыць і працаваць па-камуністычнаму». Гэты рух не толькі садзейнічае павышэнню вытворчасці працы, але і стымулюе духоўнае развіццё савецкіх людзей. Не дзіва, што ён прыкоўвае да сябе цікавасць савецкай навуковай думкі. Першая Усесаюзная навуковая нарада і заклікана паказаць ролю КПСС у арганізацыі руху брыгад і ўдарнікаў камуністычнай працы, высветліць значэнне гэтай новай вышэйшай формы спаборніцтва ў стварэнні матэрыяльных і духоўных фактараў будаўніцтва камунізма.

Усесаюзная навуковая нарада павінна прыцягнуць увагу нашых студэнтаў. Савет СНТ універсітэта рашыў ў снежні 1960 года правесці студэнцкую навуковую канферэнцыю, прысвечаную гэтаму пытанню. Ужо ў мінулым вучэбным годзе некаторыя студэнты гістфака прысвяцілі свае курсавыя і дыпломныя работы брыгадам камуністычнай працы. Асобныя з гэтых работ атрымалі высокую ацэнку.

Зараз аб найвялікшым руху сучаснасці ва універсітэце распрацавана прыкладная тэматыка дакладаў, з якой студэнты могуць пазнаёміцца на кафедрах грамадскіх навук або ў Савеце СНТ. Па загаду рэктарата студэнтам стацыянара і завочнага факультэта будуць рэкамендаваны тэмы для курсавых, кантрольных і дыпломных работ, а таксама для дакладаў у навуковых гуртках па пытаннях, якія звязаны з вывучэннем і абагульненнем дзейнасці брыгад камуністычнай працы. Студэнцкі навуковы актыў павінен уключыцца ў падрыхтоўку навуковых дакладаў па гэтай тэматыцы. Пажадана выкарыстаць летнія канікулы для збору фактычнага матэрыялу на прадпрыемствах рэспублікі. З выбарам тэмы даклада не варта марудзіць, каб ужо цяпер пры дапамозе навуковых кіраўнікоў скласці план распрацоўкі тэмы і атрымаць адпаведныя ўказанні і рэкамендацыі па збору матэрыялу. Такая падрыхтоўка аблегчыць далейшую работу над тэмай.

Матэрыялы, сабраныя па месцы правядзення летніх канікул з розных раёнаў Беларусі, наглядна пакажуць размах і разнабаковасць руху брыгад і ўдарнікаў камуністычнай працы.

В. СНАПКО,
старшыня СНТ універсітэта.

У. М. ПЕРЦАЎ

3 чэрвеня 1960 года па 83-м годзе жыцця пасля цяжкай хваробы памёр адзін з вядомых вучоных і грамадскіх дзеячоў нашай рэспублікі, акадэмік Акадэміі навук БССР, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, заслужаны дзеяч навукі БССР, загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, доктар гістарычных навук, прафесар Уладзімір Мікалаевіч Перцаў.

У. М. Перцаў нарадзіўся ў 1877 годзе. У 1897 годзе У. М. Перцаў паступіў у Маскоўскі універсітэт. Ужо тут праявіліся яго здольнасці гісторыка-даследчыка. У гады вучобы ва універсітэце У. М. Перцаў двойчы падвяргаўся паліцэйскім праследаванням за ўдзел у рэвалюцыйным руху студэнцтва.

Скончыўшы універсітэт у 1903 годзе, Уладзімір Мікалаевіч усё сваё жыццё прысвяціў навукова-даследчай рабоце і педагагічнай дзейнасці ў галіне гістарычнай навукі.

Нягледзячы на перашкоды, якія ставіла яму царская паліцыя, Уладзімір Мікалаевіч праводзіў выкладчыцкую работу ў навучальных установах, а ў час рэвалюцыі 1905—1907 гг. чытаў лекцыі для рабочых Замаскварэцкага раёна.

З 1921 года навуковая і педагагічная дзейнасць Уладзіміра Мікалаевіча Перцава цалкам звязана з Беларуссю. Ён прымаў актыўны ўдзел у арганізацыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, быў выбраны прафесарам па кафедры гісторыі сярэдніх вякоў. У 1924 годзе Уладзіміру Мікалаевічу прысвоена вучоная ступень доктара гістарычных навук, а ў 1940 годзе ён быў выбраны правадзейным членам Акадэміі навук Беларускай ССР.

Больш чым 57 год свайго жыцця аддаў Уладзімір Мікалаевіч навуцы. За гэты час ён напісаў звыш 200 навуковых работ.

Многа і паспяхова працаваў Уладзімір Мікалаевіч у галіне вывучэння гісторыі беларускага народа. Ён апублікаваў рад каштоўных даследаванняў па сярэдневяковай гісторыі Беларусі. Ён з'яўляўся рэдактарам важнейшых абагульняючых прац і зборнікаў дакументаў па гісторыі Беларусі, выдадзеных у пасляваенныя гады.

На працягу многіх год Уладзімір Мікалаевіч кіраваў кафедрай усеагульнай гісторыі Белдзяржуніверсітэта, з'яўляўся акадэмікам-сакратаром аддзялення грамадскіх навук Акадэміі навук БССР.

Уладзімір Мікалаевіч выхаваў цэлае пакаленне гісторыкаў—вучоных і педагогаў. Ён быў не толькі выдатным вучоным, але і актыўным грамадскім дзеячом. У пасляваенныя гады У. М. Перцаў прадстаўляў Беларускую ССР у якасці члена дэлегацыі на канферэнцыі Аб'яднаных Нацый у Сан-Францыска. Неаднаразова выбіраўся Уладзімір Мікалаевіч дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР і з'яўляўся членам прэзідыума Акадэміі навук БССР.

За пматгадовую і плённую навуковую, педагагічную і грамадскую дзейнасць Уладзімір Мікалаевіч быў узнагароджаны ўрадам трыма ордэнамі Леніна, медалем «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.» і Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Усё сваё жыццё Уладзімір Мікалаевіч прысвяціў беззаветнаму служэнню народу, сваёй сацыялістычнай Радзіме. Сціплы чалавек, нястомны працаўнік навукі, выдатны таварыш, чалавек вялікай душы, энцыклапедычных ведаў, які страсна любіў жыццё, Уладзімір Мікалаевіч заўсёды карыстаўся глыбокай павагай і любоўю ўсіх, хто яго ведаў. Такім назаўсёды застанецца ў нашай памяці вобраз незабыўнага таварыша і друга Уладзіміра Мікалаевіча Перцава.

Шаура В. Ф., Капіч М. Ф., Халіпаў М. А., Купрэвіч В. Ф., Лукашэвіч Д. А., Крапіва К. К., Лукашоў К. І., Гарбуноў Ц. С. ,Несцяровіч М. Д., Ярмоленка М. Ф., Сеўчанка А. Н., Вінакураў Ф. П., Рудак А. Д., Краўчанка І. С., Ільюшын І. М., Дарашэвіч М. В., Кісялёў Р. Я., Махнач А. С., Каменская Н. В., Павецьеў Г. А., Раманоўскі В. Ф., Шабуня К. І., Палікарповіч К. М., Карпачоў Е. М., Абецадарскі Л. С., Савачкін П. З., Шнеерсон Л. М., Ліўшыц Г. М., Сярко Д. І., Лакін Е. І., Палонскі А. В.

ПІСЬМО У РЭДАКЦЫЮ

ЯК БЫЦЬ, ПАРАЙЦЕ...

Паважаная рэдакцыя!

Жывём мы па вуліцы Свярдлова.

Усе мы—з аднаго факультэта. Трое нават з аднаго курса.

Пакой у нас не сказаць каб і занадта вялікі, але як раз на чатырох чалавек. Ён цёплы, утульны, багата сонца, буфет пры баку—што яшчэ трэба?

Выбралі мяне хлопцы старастам. Я надта і не ўпіраўся: хто ж не хоча пахадзіць у начальніках?

Раздабыў таз, вядро для смецця, мяцёлку, анучу— словам, усё неабходнае для ўборкі. Крыху папацеў, і склаў графік уборкі пакоя. Не на месяц, не на два, а на цэлы год. Адмысловы атрымаўся графік! Паглядзеў на яго, і, помніцца, падумаў, што ўборка цяпер пойдзе бесперабойна, як па канвееру. З дня ў дзень, з тыдня ў тыдзень, з месяца ў месяц... Графік усім спадабаўся, асабліва дэвіз: «Чысціня—залог здароўя».

Але тады я нават і не думаў, колькі клопату, непакою, турбот дасць мне мая высокая пасада старасты пакоя.

Ішлі дні, свежапафарбаваная падлога паступова чарнела. З кожным тыднем усё больш і больш. Чамусьці ніхто з нас не адважыўся першым памыць яе. Нарэшце, неяк сяк-так памылі.

Усё менш і менш любаваліся хлопцы цудоўным графікам. І адкуль толькі браўся пыл!?

Але мае хлопцы абыякава адносіліся і да пылу, і да смецця... Яны проста прывыклі не заўважаць бруд. Я спрабаваў прымяняць палітыку «з пазіцыі сілы», лісліва ўгаворваў іх, імкнуўся заразіць іх уласным прыкладам. Дарэмная справа!

А ў апошні час мае хлопцы праўзайшлі самі сябе.

Цэлы сонм мудрацоў усіх часін і народаў паўрад ці прыдумаў бы такі выдатны спосаб адлынівацъ ад уборкі пакоя.

Ранейшыя спосабы былі досыць прымітыўнымі.

Адзін, напрыклад, казаў, што ён толькі начуе тут, а днём не бывае; другі спасылаўся на тое, што ён пяцікурснік і не ў яго ўзросце вазіцца з мяцёлкай; трэці нечакана захварэў у дзень яго дзяжурства і г. д. Словам, спосабаў багата. У нас іх налічвалася каля сотні.

А сто першы—гэта самы верны і безадказны. І надзвычай просты: сёння ўбіраць такому та жыхару (згодна графіка). Для бачнасці хлопец крыху паводзіць на падлозе, раскідае смецце па кутках—і гатова.

Назаўтра новы дзяжурны заяўляе: «Дзяжурства ад NN не прымаю—дрэнна ўбраў». Пасля заўтра не прымае дзяжурства новы дзяжурны. Так і ідзе па колу. А дзе ж выхад? У гэтым і ўвесь смак новага спосабу!..

Хлопцам добра, а мне? Мяне лаюць розныя камісіі, камендант інтэрната не дае жыцця. Больш таго, я яго баюся, як агню...

А калі гаварыць сур'ёзна, дык за што ж на мяне сварыцца? Я ж раблю ўсё магчымае, каб ў пакоі было чыста. Як быць? Парайце...

І. ПАТАПАЎ,
староста пакоя № 13 інтэрната па вуліцы Свярдлова.

АД РЭДАКЦЫІ. Калі супрацоўнік рэдакцыі пазнаёміў з пісьмом І. Патапава жыхароў 51 пакоя корпуса «Б» інтэрната па Бабруйскай, хлопцы шчыра здзівіліся. Яны ніяк не маглі ўцяміць, як гэта студэнты—людзі дарослыя, адукаваныя—не навядуць у сябе парадак.

51 пакой лічыцца адным з лепшых у інтэрнаце. У ім жывуць пяць студэнтаў 5-га курса матэматычнага факультэта. Жывуць разам з першага курса. Кожны год мяняўся староста пакоя: на першым курсе ім быў абраны Іван Пятровіч, на другім—Апатоль Бабарыка, потым—Генадзь Дудкін, Іван Марозаў, цяпер гэтыя абавязкі выконвае Аляксей Нікіцін.

Аляксей расказвае, што калі б у пакоі не было дружнага калектыву, не было б ні чысціні, ні парадку. У 51 першым пакоі не патрэбен нават графік дзяжурства. Кожны ведае, што ён жыве не адзін, і ніколі не бывае так, што хто-небудзь узвальвае сваю працу на другога.

Матэматыкі раілі ўспомніць аўтару пісьма і тое, што акрамя мер пераканання ёсць яшчэ і меры прымушэння. А Патапаў, як гэта выцякае з пісьма, відаць, баіцца сапсаваць адносіны са сваімі калегамі па пакою. Нават у пісьме ён не захацеў назваць іх прозвішчы. Ці не таму яно і прагучэла так бездапаможна?

Здаецца, да слоў хлопцаў з 51 пакоя няма чаго дадаць!

СПОРТ

Прыкры зрыў

Больш 400 спартсменаў 22 ВНУ рэспублікі аспрэчвалі першынство па лёгкай атлетыцы па праграме 5-й студэнцкай спартакіяды. Наш універсітэт выступаў па першай групе.

Многія лёгкаатлеты універсітэта паказалі высокія спартыўныя вынікі. Так, вельмі выраслі бегуны. Студэнт гістфака Базылеў заняў першае месца ў бегу на 5000 метраў. Дарэчы, на міжведамственным першынстве ён на гэтай дыстанцыі паказаў 14: 56,0 мінуты. Усяго толькі 6 секунд не хапіла Базылеву да нарматыва першага разраду.

Вынік міжнароднага класа паказаў у спартыўнай хадзьбе Альберт Котаў. 10 кілометраў ён прайшоў за 45 мінут 46 секунд. Гэта вышэй нарматыва майстра спорта. Удала выступіў таксама Князюк, які пераадолеў 800 метраў за 2:0,1 мінуты. Па паказаных выніках увайшлі ў зборную горада нашы студэнты Лаўнікоўіч, Лаўруковіч, Зюзіна.

І ўсё ж у камандным заліку нашы лёгкаатлеты аказаліся на 3-ім месцы. Усяго 1000 ачкоў яны прайгралі камандзе Гомельскага педінстытута. Адбілася адсутнасць ва універсітэце добрых штурхальнікаў ядра і кідальнікаў дыска. Ніводзін з іх не даў заліку. Каб мятальнікі далі залік, нашы лёгкаатлеты апярэдзілі б Гомельскі педінстытут на 4000 ачкоў.

Аднак, за нашымі лёгкаатлетамі засталося права выступіць на Усесаюзнай лёгкаатлетычнай спартакіядзе студэнтаў у Харкаве. Справа ў тым, што пакольку Гомельскі педінстытут мае ў сваім складзе факультэт фізічнага выхавання, ён адносіцца да ліку спецыялізаваных навучальных установ. Згодна з палажэннем, толькі адна з іх можа быць прадстаўлена ад рэспублікі на Усесаюзным першынстве. Такога права дабіліся спартсмены ІФК, якія занялі першае месца.

У. КУШНАРОЎ,
трэнер па лёгкай атлетыцы.

Таварысцкія сустрэчы спартсменаў

За апошні час ажывілася фізкультурна-спартыўная работа сярод выкладчыкаў юрыдычнага і гістарычнага факультэтаў. На гэтых факультэтах праведзены шахматныя турніры, а на юрфаку—таксама шахматны турнір і стралковыя спаборніцтвы. Стала добрай традыцыяй правядзенне таварысцкіх сустрэч паміж камандамі гэтых факультэтаў па розных відах спорту. Адбыліся спаборніцтвы па шахматах, шашках, валейболу і стральбе. Па валейболу перамогу атрымалі гісторыкі, а па астатніх відах спорта—юрысты. Шахматысты перамаглі з лікам 4,5:1,5, шашысты—2,5:0,5.

Падобныя таварысцкія сустрэчы будуць праводзіцца і ў далейшым.

Т. КАЛЕСНІКАВА

Анатоль Самусеў—чэмпіён горада

Вялікую колькасць турыстаў прыцягнулі спаборніцтвы на першынство горада Мінска па праходжанню закрытага турысцкага маршрута. Спаборніцтвы праходзілі ў маляўнічай мясцовасці, паблізу чыгуначнай станцыі Зялёнае. Кожны ўдзельнік павінен быў прайсці 5 розных этапаў, прычым напрамак кожнага наступнага этапа станавіўся вядомым яму пры ўмове паспяховага праходжання папярэдняга.

Адзін за другім выходзяць на старт прадстаўнікі турысцкіх калектываў горада. Сярод стартуючых—шэсць членаў турысцкай секцыі БДУ. Балельшчыкі—знаўцы турызма— выказваюць свае прагнозы. Але ніхто не думаў, што пераможа студэнт 4 курса матэматычнага факультэта Анатоль Самусеў. Дзесяцікіламетровы шлях па невядомай, цяжкай для праходжання трасе ён пераадолеў менш чым за дзве гадзіны. Уся турысцкая секцыя БДУ была задаволена поспехам свайго выхаванца. Другі прадстаўнік універсітэта Уладзімір Берзін (2 курс фізфака) быў на фінішы чацвертым.

В.ОБУХАЎ,
удзельнік спаборніцтваў.

Зноў перамога

Нядаўна ў басейне ІФК праводзіліся спаборніцтвы па плаванню ў праграме рэспубліканскай спартакіяды ДСТ «Буравесцік». У адрозненне ад мінулых год колькасць членаў каманды была зменшана ўдвая. Згодна з палажэннем, да спаборніцтваў дапускаліся толькі плаўцы з другім спартыўным разрадам. Для некаторых ВНУ, у тым ліку і для палітэхнічнага інстытута, было зроблена выключэнне—у склад іх каманд уваходзілі і спартсмены 3 разрада.

Трэба адзначыць, што палітэхнікі ў параўнанні з нашымі плаўцамі маюць больш спрыяльныя ўмовы для вучэбна-трэніровачнай работы. Палітэхнікі арэндуюць на 18 гадзін у тыдзень басейн ІФК, а універсітэт арэндаваў да 1 студзеня гэтага года на 6 гадзін, а зараз—толькі на 4.

Нягледзячы на гэта, зборная каманда універсітэта паказала сябе валявым, дысцыплінаваным калектывам і здолела апярэдзіць плаўцоў БПІ. Нашы спартсмены занялі другое месца, прапусціўшы ўперад толькі плаўцоў ІФК.

Асабліва хочацца адзначыць студэнтку 5 курса матэматычнага факультэта Пціцыну, якая ў дзень спаборніцтваў на «выдатна» абараніла дыпломную работу, а ў басейне ІФК таксама выдатна абараняла спартыўны гонар універсітэта. Студэнт 4 курса геафака З. Фінеўка таксама паспяхова спалучае добрую вучобу з заняткамі спортам.

Вельмі карысным было для каманды выступленне студэнта І курса хімічнага факультэта Я. Ямельянава. Ён прынёс сваёй камандзе больш 2 000 ачкоў.

Перамога над плаўцамі палітэхнічнага інстытута з перавагай у 2,5 тысячы ачкоў з'яўляецца пераканаўчым доказам узросшага спартыўнага майстэрства нашых студэнтаў.

М. КАВАЛЕНКА,
трэнер па плаванню.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 31; тэл. 2-07-19. Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

АТ 06938. Зак. 1103. Друкарня выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна. Тыраж 2000.